# *§ 28–0. Рэлігійнае жыццё на тэрыторыі Беларусі

**1. Поліканфесійны характар грамадства ВКЛ.** Вялікае Княства Літоўскае было поліканфесійнай дзяржавай, што было абумоўлена як рэлігійнымі працэсамі ў краіне на працягу Сярэднявечча і Новага часу, так і знаходжаннем у ВКЛ мноства этнічных груп.

Пануючым веравызнаннем на тэрыторыі Беларусі ад X ст. з’яўлялася хрысціянства паводле візантыйскага ўзору, прыхільнікамі якога была абсалютная большасць беларускага, украінскага і рускага насельніцтва. Пачынаючы з XIV ст. праваслаўе пачало пашырацца сярод літоўскага насельніцтва ВКЛ, аднак гэты працэс быў спынены заключэннем Крэўскай уніі і хрышчэннем Літвы ў канцы XIV — пачатку XV ст. паводле каталіцкага абраду.

Складаныя канфесійныя працэсы ў ВКЛ у перыяд Позняга сярэднявечча і ранняга Новага часу спрыялі рэлігійным трансфармацыям у беларускім грамадстве. Да XVI ст. праваслаўная царква працягвала дамінаваць у дзяржаве. За кошт ахвяраванняў буйны́х праваслаўных феадалаў працягвалася будаўніцтва праваслаўных цэркваў і манастыроў. У 1498 г. намаганнямі Аляксандра Хадкевіча быў заснаваны Супрасльскі манастыр, які ў далейшым зрабіўся буйны́м цэнтрам праваслаўнага жыцця. Значныя сродкі ў падтрымку царквы выдзяляў Канстанцін Астрожскі.




*Званіца. Супрасльскі Дабравешчанскі манастыр. Фота з часопіса «Новая ілюстрацыя». 1900 г.*

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, высветліце, якія важныя культурныя і мастацкія аб’екты захоўваюцца ў Супрасльскім манастыры.

1. Успомніце, якія гістарычныя падзеі папярэднічалі ўзнікненню пратэстантызму.
2. Назавіце асноўныя прынцыпы пратэстантызму. У чым палягаюць адрозненні паміж асноўнымі пратэстанцкімі канфесіямі?

Аднак дзяржаўная палітыка спрыяла пераходу праваслаўнай знаці ў каталіцызм. З 1385 г. вялікімі князямі літоўскімі былі выключна каталікі. Напачатку XVI ст. каталіцкая царква мела ўжо досыць трывалыя пазіцыі.

У сярэдзіне XVI ст. у Беларусі пачаў пашырацца рэфармацыйны рух. Рэфармацыя адыграла велізарную ролю ў актывізацыі духоўнага жыцця беларускага грамадства, культурных кантактаў з іншымі еўрапейскімі краінамі, абагачэнні беларускай культуры дасягненнямі еўрапейскай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Разам з тым пераход з праваслаўя ў пратэстантызм змяняў традыцыйны светапогляд чалавека, культываваў у ім заходнееўрапейскія культурныя стэрэатыпы, аддаляў яго ад беларускай народнай культуры.

Контррэфармацыя ў ВКЛ адмоўна паўплывала не толькі на мясцовы пратэстанцкі рух, але і на праваслаўную царкву. Праваслаўная і пратэстанцкая цэрквы, нягледзячы на палажэнні Статута ВКЛ 1588 г. і іншых нарматыўных актаў аб свабодзе веравызнання, трапіла ў цяжкае становішча.



*Мялецій Сматрыцкі. 1650 г.*

Праваслаўны палеміст Мялецій Сматрыцкі ў сваім творы «Трэнас», выдадзеным у 1610 г., назваў 47 магнацкіх родаў, якія пакінулі праваслаўную царкву.

*Як вы лічыце, чаму прадстаўнікі беларускай праваслаўнай арыстакратыі пачалі пераходзіць у каталіцызм?*

Ва ўмовах развіцця Контррэфармацыі і паступовага аслаблення пазіцый праваслаўнай царквы адрадзілася ідэя заключэння царкоўнай уніі.

Рашэнні Берасцейскага (Брэсцкага) сабора не былі прынятыя часткай праваслаўнай супольнасці. Супраць уніі выступілі некаторыя прадстаўнікі праваслаўнай знаці, многія дзеячы духавенства, а таксама брацтвы. У праваслаўнай царкве ВКЛ адбыўся раскол на прыхільнікаў уніі — «уніятаў» і яе праціўнікаў — «дызунітаў». І тыя і другія аднолькава лічылі сябе праваслаўнымі, аднак легальны статус мелі толькі прыхільнікі уніі. Праціўнікі уніі з пункту погляду каралеўскай улады і кіраўніцтва Кіеўскай мітраполіі разглядаліся як «схізматыкі», г. зн. раскольнікі, якія адмаўляюцца падпарадкоўвацца сваім законным духоўным пастырам. Такім чынам, заключэнне царкоўнай уніі не дасягнула сваёй галоўнай мэты — зніжэння вастрыні міжканфесійнай барацьбы, а спарадзіла яшчэ глыбейшы раскол у беларускім грамадстве.

У 1620 г. праціўнікі уніі пры пасярэдніцтве іерусалімскага патрыярха стварылі ўласную іерархію, у выніку чаго ў фармальна адзінай Кіеўскай мітраполіі ўзнікла двоеўладдзе. Пасля прызнання каралём Уладзіславам IV у 1633 г. праваслаўнай іерархіі законны статус праваслаўнай царквы быў адноўлены. Такім чынам, у Рэчы Паспалітай узніклі дзве царквы «грэчаскага» абраду — праваслаўная і ўніяцкая. На чале кожнай стаяў мітрапаліт, які меў тытул «кіеўскага і ўсяе Русі», аднак рэзідэнцыя праваслаўнага знаходзілася ў Кіеве, а ўніяцкага — у Вільні.

Пазбаўленая беспярэчнай каралеўскай падтрымкі, уніяцкая царква, тым не менш, працягвала сваю дзейнасць, яе аўтарытэт дзякуючы актыўнай дзейнасці базыльян паступова ўзрастаў. Істотную ролю ў гэтым адыграў і пераход ва унію яе ранейшага праціўніка Мялеція Сматрыцкага.

1. Ахарактарызуйце канфесійнае становішча на тэрыторыі Беларусі ў X–XVIII стст.
2. Дакажыце, што ў Рэчы Паспалітай у XVI–XVII стст. нарастала рэлігійная нецярпімасць да некаталікоў.

У другой палове XVII ст. у грамадска-палітычным жыцці ўзмацніліся праявы рэлігійнай нецярпімасці. Пераход у 1686 г. праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай пад юрысдыкцыю маскоўскага патрыярха паспрыяў узмацненню негатыўнага стаўлення кіруючых колаў Рэчы Паспалітай да гэтай канфесіі. У такіх умовах у апошняй траціне XVII — першай палове XVIII ст. уніяцтва пачало актыўна пашырацца сярод беларускага сялянства і мяшчанства, а таксама дробнай шляхты. Гэта шмат у чым было звязана з адсутнасцю істотных адрозненняў у набажэнствах і з успрыняццем уніяцкай царквы як своеасаблівай памеснай царквы «рускага» народа Рэчы Паспалітай. Уніяцкія святары паходзілі з мясцовага насельніцтва і, як сяляне і мяшчане, былі носьбітамі культурных традыцый беларускага народа.

**2. Этнічныя і рэлігійныя групы ВКЛ.** ВКЛ было шматнацыянальнай дзяржавай, у якой разам з беларусамі жылі прадстаўнікі іншых этнасаў. Некаторыя з народаў, напрыклад літоўцы, як і беларусы, удзельнічалі ў стварэнні ВКЛ; прадстаўнікі іншых народаў, напрыклад татары і яўрэі, перасяліліся сюды з іншых краін.

Паўночна-заходняя частка ВКЛ з'яўлялася этнічнай тэрыторыяй літоўскага этнасу, невыпадкова таму Панямонне было рэгіёнам супольнага пражывання беларусаў і літоўцаў. Менавіта тут у XIII ст. зарадзілася Вялікае Княства, яно ж у далейшым склала ядро дзяржавы. У выніку славянскага культурнага ўплыву ў літоўскую мову пранікла значная колькасць славянскіх слоў, частка літоўскай знаці прыняла праваслаўе. Да канца XIV — пачатку XV ст. літоўцы захоўвалі язычніцтва, пасля заключэння Крэўскай уніі большая частка літоўцаў перайшла ў каталіцызм.

Палітычныя працэсы, што адбываліся ў перыяд Сярэднявечча і ранняга Новага часу, у сукупнасці з геаграфічным становішчам Беларусі абумовілі

пражыванне на беларускай зямлі прадстаўнікоў суседніх славянскіх этнасаў — палякаў, рускіх і ўкраінцаў. У другой палове XVII ст. у сувязі з рэлігійнымі працэсамі ў Расійскай дзяржаве пачалося масавае перасяленне ў Беларусь рускіх стараверяў, арэалам расслення якіх зрабіліся Пасожжа, Падняпроўе і Падзвінне. Адным з найбуйнейшых цэнтраў стараверства зрабілася заснаванае імі мястэчка Ветка. Вакол яго ўтварылася шмат слабод, з'явіліся ўплывовыя манастыры.

Напачатку XIV ст. у ВКЛ з'явілася нямецкае насельніцтва. На запрашэнне Гедыміна ў Беларусь прыбывалі нямецкія рамеснікі і купцы, якія сяліліся ў гарадах і маёнтках феадалаў. Немцы першапачаткова вызнавалі каталіцызм, пасля Рэфармацыі значная частка нямецкага насельніцтва схілілася да лютэранства.

У пачатку XIV ст. на беларускай зямлі з'явіліся прадстаўнікі татарскага этнасу. Іх з'яўленне было абумоўлена дзяржаўнымі інтарэсамі ў барацьбе супраць нямецкіх крыжакоў і Польшчы. У канцы XIV ст. у ВКЛ уцёк залатаардынскі хан Тахтамыш са сваімі людзьмі, якіх Вітаўт рассяліў у Панямонні. Татары рассяляліся племяннымі групамі — улусамі, аднак у сувязі з тым, што яны асядалі ў Беларусі не аднамоманта, улусы не займалі нейкага пэўнага павета. У сацыяльна-эканамічных адносінах татарскае насельніцтва ў XVI–XVII стст. дзялілася на тры групы. Найбольш прывілеяваную групу татар складалі нашчадкі залатаардынскіх ханаў і мірзаў, што атрымалі ў ВКЛ тытулы князёў. Яны валодалі вотчынамі з сялянамі, за што мусілі несці вайсковую службу.



*Ротмістр татарскай кавалерыі. Каля 1660 г.*

Другой групай татарскага насельніцтва былі нашчадкі простых воінаў, якія атрымалі зямельныя надзелы, за што былі абавязаны выконваць вайсковую, кур'ерскую і іншыя павіннасці на карысць вялікага князя. Татары служылі перакладчыкамі канцы-


Привилегия
евреям
Витовта Великого
1388 года

Serenissimus
atq victorio
sissimus Prin
ceps et do
minus Dominus
SIGISMVNDVS
dei gratia Rex Polo
Magnus dux lituae
Russie Prussie Sama
gitie Mazouieq etc
dominus & heres.

Прывілей Вітаўта яўрэям. ВКЛ. 1388–1389 гг.

лярыі ВКЛ, ездзілі пасламі ў Арду і Крым. Значная частка татарскіх ваяроў атрымала шляхецтва. Трэцяя група татар адносілася да непрывілеяваных пластоў насельніцтва. Асноўнымі яе заняткамі былі рамізніцтва, гарбарства, агародніцтва, жывёлагадоўля. Паступова татары пакінулі родную мову, перайшлі на старабеларускую, але захавалі пры гэтым арабскую графіку. На старабеларускай мове арабскім пісьмом была створана багатая літаратура беларускіх татар. З узмацненнем працэсу паланізацыі татарская знаць перайшла на польскую мову. Разам з тым татары захавалі традыцыйную для іх рэлігію — іслам суніцкага кірунку. Татарскае насельніцтва мела права будаваць мячэці. Іх узначальвалі мулы (імамы). Мячэці выконвалі не толькі рэлігійныя, аде і судова-адміністрацыйныя функцыі. Набажэнствы вяліся на арабскай мове, пропаведзі прамаўляліся на татарскай, а пазней на старабеларускай. У XVI–XVIII стст. на тэрыторыі ВКЛ дзейнічала 20 мячэцяў.

Напрыканцы XIV ст. у Беларусі з’явіліся прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва. Іх перасяленне на беларускую зямлю было звязана з рэлігійнай нецярпімасцю ў краінах Заходняй Еўропы і, наадварот, рэлігійнай талерантнасцю ў ВКЛ. У перыяд праўлення Вітаўта першыя яўрэйскія абшчыны з’явіліся ў Брэсце і Гродне. Масавая міграцыя яўрэйскага насельніцтва ў Беларусь адбывалася ў перыяд праўлення Казіміра IV. Яўрэі сяліліся ў гарадах, а пазней і ў мястэчках, дзе займаліся гандлем, рамяством; аўтарытэтам карысталіся яўрэйскія медыкі і вучоныя. Сферай іх дзейнасці таксама былі арганізацыя збору падаткаў, гандлёвых мытаў, ліхвярства.

Яўрэі жылі асобнымі абшчынамі — кагаламі, што фарміравалі асобныя кварталы беларускіх гарадоў. Нягледзячы на тое што ў дачыненні да яўрэйскага насельніцтва дзейнічалі пэўныя абмежаванні — напрыклад, яны не маглі валодаць зямлёй

і служыць у войску ВКЛ, — дзяржаўная ўлада і буйны́я феадалы пазітыўна ставіліся да прадстаўнікоў гэтай этнічнай меншасці. У XVII ст. узнік Літоўскі Ваад — найвышэйшы орган літоўскай аўтаноміі ў ВКЛ, у кампетэнцыі якога знаходзілася вырашэнне спрэчных рэлігійных, судовых і адміністрацыйных спраў яўрэйскага насельніцтва. У XVII–XVIII стст. ВКЛ было адным з найбуйнейшых цэнтраў яўрэйскай вучонасці. Вялікую ролю ў духоўным і паўсядзённым жыцці яўрэйскага насельніцтва адыгрывалі рабіны. Яўрэі вызнавалі сваю рэлігію — іудаізм, мелі права будаваць сінагогі. Нягледзячы на кантакты з беларускім насельніцтвам, яўрэі захавалі сваю гутарковую мову — ідыш, у літургічных мэтах выкарыстоўвалася старажытнаяўрэйская мова — іўрыт.

Радзімай цыганоў з’яўляецца Індыя. У X ст. яны трапілі ў Візантыю, адкуль паступова рассяліліся на Балканах. У XV ст. цыганы распаўсюдзіліся ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. У ВКЛ яны прыйшлі з Польшчы і Венгрыі. У 1501 г. вялікі князь Аляксандр афіцыйна дазволіў цыганам сяліцца ў ВКЛ. Цыганы жылі сямейнымі групамі — табарамі, на чале якіх стаялі бароны. Цыганскае насельніцтва займалася разнастайнымі рамёствамі, гандлем коньмі. Валацужныя табары цыганоў збіраліся пры буйны́х кірмашах каля Гомеля, Хальча, Веткі. Найбольш значным месцам збору было мястэчка Зэльва. Аселыя цыганы жылі ў мястэчку Мір. Цыганы захавалі сваю родную мову, часта вызнавалі тую рэлігію, якой прытрымлівалася мясцовае насельніцтва.

У XVI–XVII стст. у Беларусі з’явіліся шкоты — шатландскія мігранты. Шатландцы служылі ў войску ВКЛ, займаліся гандлем, навукай. Яны былі кальвіністамі і сяліліся пераважна ў гарадах і мястэчках, што належалі беларускім феадалам-аднаверцам. Найбольшая колькасць шатландцаў у Беларусі жыла

ў Слуцку. У XVII–XVIII стст. большасць шатландцаў асімілявалася з беларускім насельніцтвам.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*1. Назавіце, якія рэлігіі і канфесіі былі прадстаўлены ў Вялікім Княстве Літоўскім. Якія гістарычныя падзеі паспрыялі іх з'яўленню на тэрыторыі Беларусі і якое месца яны займалі ў грамадстве?*

*2. У чым заключалася ўзаемная зацікаўленасць вялікіх князёў літоўскіх і народаў, што перасяляліся на землі ВКЛ?*

*3. Запоўніце табліцу «Этнічныя і рэлігійныя групы ВКЛ».*

| Этнічныя і рэлігійныя групы | Час з'яўлення | Прычыны з'яўлення на беларускіх землях | Асноўныя заняткі |
|---|---|---|---|
| | | | |